# Літаратурна-музычная кампазіцыя
# “Ішоў мой край дарогамі вайны”

Да 81-ай гадавіны вызвалення Чачэрска і Чачэрскага раёна
ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**Л. В. Еўстраценка,**
намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце
гімназіі г. Чачэрска

*Цячэ гісторыі рака,*
*І кожны міг там нешта значыць.*
*Жыццю не крыкнеш «Пачакай!»,*
*Падзей былых не перайначыш.*
*М. Болсун*

**Вядучы 1.** 81 год прайшоў з таго дня, калі наш горад быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Здаецца, даўно ўжо патрэбна было забыць, пахаваць вайну, але памяць наша пра яе не дае гэтага зрабіць.

**Вядучы 2.** І гонар, і радасць, і слёзы, і боль страт – усе злучылася ў Вялікай Перамозе… Сёння мы, моладзь, ведаем, якой страшнай была цана гэтай Перамогі, і не маем права забываць пра гэта.

**Чытальнік**

Памяць, памяць, за сабой пакліч ты
У тыя жудасныя дні,
І сяброў маіх з магіл уздымі ты,
Іншым маладосць вярні.

**Чытальнік**

Памяць, памяць, ты павінна
На імгненне стрэлкі павярнуць,
Я хачу не проста ўспомніць іх імёны,

Я хачу сябрам у вочы зазірнуць.

**Вядучы 1.** Памяці тых, хто заваяваў перамогу над ворагам, прысвячаецца.

*Гасне святло. Гучаць пазыўныя.*

Год за годам зара над зямлёю ўставала,

Прачыналася і наша краіна.

І любоўю сваёй саргравала

Юнакоў, хлапчукоў, мужыкоў.

*Мелодыя абрываецца. Раскаты грому.*

Сорак першы ўдарыў раптоўным агнём,

Падвязаў хлапчукоў салдацкім рамнём.

*Юнакі выходзяць на авансцэну да мікрафона.*

Глядзіць на іх радзіма, вочы суровы.

Адкуль вы? Хто вы? На што вы готовы?

1-ы: Гатовы на бітвы, на годы расстанняў.

2-і: Гатовы на радасць пераможных агнёў.

3-і: На голад, на холад гатовы.

4-ы: Гатовы на ўсё для Радзімы сваёй.

*Фанаграма песні «Священная война». На сцэне група выконвае «Да сустрэчы, юнакі».*

Ах, вайна, что ж зрабіла ты, подлая.

(*Выходзяць 3 юнакі і дзяўчынкі, трымаюцца за рукі.)*

Сталі ціхімі нашы двары,

Юнакі паўздымалі галовы,

Пасталелі яны без пары.

*(Выходзіць ваенком, чытае загад. Размыкае рукі парам. Юнакі аддаюць чэсць, бяруць зброю, на галовы надзяваюць фуражкі.)*

На парозе крыху памаячылі

І пайшлі за салдатам салдат…

*(Устаюць у калону і ідуць, маршыруючы.)*

Да сустрэчы, хлопчыкі мілыя,

Да сустрэчы, дарагія мае!

*(Дзяўчынкі машуць ім рукамі, плачуць.)*

Не хавайцеся, будзьце высокімі.

Не шкадуйце ні куль, ні гранат.

І сябе не шкадуйце.

Пастарайтеся вярнуцца назад!

*Зацямненне.*

*Музычны нумар.*

**Вядучы 2.** У ноч на 14 жніўня нашы войскі пакінулі Чачэрск. У 8 гадзін раніцы на яго вуліцах з'явіліся нямецкія матацыклісты. Чачэрскі раён разам з іншымі тэрыторыямі Беларусі быў акупіраваны ворагам. Акупанты адразу пачалі ўстанаўліваць так званы новы парадак. Пачаліся распаравы, рабаванне, гвалт. Тэрор, масавыя расстрэлы, разбой панавалі на Чачэрскай зямлі.

**Чытальнік 1**

Па зямлі, якую нашы продкі
Адстаялі ў даўнія вякі,
Рухаліся танкі, самаходкі,
Чорныя фашысцкія палкі...

Запылалі гарады і сёлы,
Гора разлілося па зямлі.
Сонца, што заўжды было вясёлым,
Жудасныя хмары абплылі....

**Вядучы 3.** Страшную трагедыю перажыў Чачэрск ў дні вайны. За 27 месяцаў акупацыі фашысты ператварылі горад у груду развалін, знішчылі 323 будынкі, разрабавалі і знішчылі ўсе прадпрыемствы раёна, калгасы, 2 МТС. У раёне была спалена 31 школа, разбураны лячэбныя ўстановы. Акупанты цалкам спалілі 14 вёсак. Усяго было знішчана і разбурана 5026 сялянскіх двароў.

**Вядучы 1.** Але самыя страшныя і жорсткія злачынствы былі звязаны з масавым знішчэннем мірных жыхароў. У першую чаргу расправам падвяргаліся камуністы, савецкія актывісты, яўрэі і цыганы. Забойствам старых, жанчын і дзяцей часта папярэднічалі катаванні. На расстрэл немцы вывозілі за горад: з левага боку дарогі, што вядзе на Гомель, забівалі яўрэйскае насельніцтва, а з правага – славян.

**Вядучы 2.** За перыяд акупацыі са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. у Чачэрскім раёне было павешана, расстраляна і закатавана 1853 чалавекі. Гвалтоўна на прымусовыя работы ў Германію было вывезена 1379 мірных жыхароў.

**Вядучы 3.** У лютым 1943 г. ў вёсцы Будзішча 27 чалавек немцы сагналі ў калгасны клуб, у якім пасля катаванняў людзі былі зажыва спалены. Падобнае злачынства фашысты здзейснілі ў вёсцы Глыбочыца, дзе ў кастрычніку 1943 г. было спалена 28 ні ў чым не вінаватых жыхароў вёскі.

**Вядучы 1.** 22 кастрычніка 1943 г. нямецкая ваенная часць ачапіла лес каля пасёлка Рэпішча. У лесе ад фашысцкіх захопнікаў хавалася 2000 чалавек, з іх у гэты дзень было расстраляна больш за 500 мірных жыхароў.

**Чытальнік 2. Якога колеру вайна?**

– Якога колеру вайна? –
Мая дачка у мяне спытала.
І я падумаў, што яна
Пад колер шэрага металу,
Пад колер шэрых шынялёў,
Пад колер шэрых папялішчаў,
Пад колер пылу тых дарог,
Дзе ў гільзе вецер грозна свішча…
Ды вочы я закрыў на міг,
І мне прыпомніўся чырвоны –
Чырвоны колер слоў маіх
І ран салдацкіх незагойных,

Агонь чырвоны ў вокнах хат,
Сцягоў святы чырвоны колер.
Чырвоны водсвет кананад,
Што не забудуцца ніколі.
Якого ж колеру вайна?
Уладна ў памяці ўсплывае
Бінтоў шпітальных белізна,
Матулі галава сівая.
І страху пабялелы твар,
І белы колер маскхалата,
І снег, што не растаў ніколі
На вуснах паўшага салдата.
А я ж у памяці нясу
Яшчэ жахлівы колер чорны –
Заледзянелы, чорны сум
Удоў і сірат незлічоных...
І чорны дым парахавы,
Дзе чорны воран на магіле.
І чорны колер у травы,
Што агнямётамі палілі.
Якога колеру вайна?
Я б расказаў дачцы нямала...
Ды на руках маіх яна
Ужо даўно спакойна спала.

**Вядучы 2.** Але ніякія зверствы акупантаў не змаглі заваяваць наш народ. Ужо ў снежні 1941 г. пачаў дзейнічаць падпольны райкам партыі, сакратаром якога быў прызначаны Павел Іванавіч Дзедзік. Чачэрская падпольная арганізацыя адразу ж пачала дзейнасць па стварэнні партызанскага атрада, які затым з’явіўся ядром першай гомельскай брыгады. А ў студзені 1942 г. у

чачэрскіх лясах было ўжо чатыры атрады: Гомельскі гарадскі, Гомельскі, Чачэрскі і Свяцілавіцкі.

**Вядучы 3.** У раёне дзейнічала 45 падпольных арганізацый, толькі ў Чачэрску іх было 5. Сярод насельніцтва вялася вялікая агітацыйная работа: выпускаліся тысячы лістовак, праводзіліся сходы і мітынгі.

**Вядучы 1.** За час баявых дзеянняў з ворагам партызаны пусцілі пад адхон 98 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага, знішчылі 162 аўтамашыны, 23 матацыклы, 2 цягачы, 1 самалёт, 38,5 км тэлефонна-тэлеграфнай лініі і шмат баявой тэхнікі ворага.

**Вядучы 2.** У баях партызаны знішчылі 2093 нямецкіх салдат, афіцэраў і здраднікаў Радзімы, разграмілі 67 сельскіх управ, 12 нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў.

**Вядучы 3.** Партызанамі было вызвалена 490 грамадзян Чачэрскага раёна, якіх немцы гналі ў Германію. Урад высока ацаніў баявую дзейнасць першай гомельскай брыгады. Больш за 100 чалавек было ўзнагароджана ордэнамі і медалямі.

*Музычны нумар*

**Вядучы 1.** 1418 дзён і начэй не сціхаў гром бітваў на вогненных рубяжах Вялікай Айчыннай вайны. 27 лістапада 1943 г. Чачэрск быў вызвалены.

Чачэрск курыўся дымам едкім,
Паўсюдна – ворагаў сляды:
Шкілеты хат – нямыя сведкі.
І зруйнаваныя сады.
І роў глыбокі ля бярозак –
Магіла брацкая ахвяр –
Запоўніў плач яўрэйкі Розы,
Які кляў катаў за кашмар.
І вось свабоды вецер свежы
Загуў шчасліва ў гарадку…
На радасцях спяшаўся снежань

Пакласці мост праз Сож-раку.

**Вядучы 2.** Нягледзячы на нечалавечую стомленасць, на велізарнае нервовае напружанне, твары нашых воінаў свяціліся радасцю. Гэта была радасць пераможцаў! Салдаты выканалі свой абавязак, доўг цяжкі і выдатны, вышэй якога няма нічога на Зямлі! Тое, чаго так доўга чакалі, да чаго непахісна ішлі цяжкай салдацкай дарогай вайны, адбылося!

**Вядучы 3.** У нашым раёне свята захоўваюць памяць аб 1378 воінах-вызваліцелях, партызанах, якія не вярнуліся з крывавых палёў вайны. Іх гераічныя ўчынкі ўшанаваныя ў помніках з мармуру, бронзы, граніту. Амаль у кожнай вёсцы ёсць абеліск, сквер, брацкая магіла.

**Вучаніца.** Калі стаю ля вечнага агню,
Я думаю пра тых, каго няма тут з намі.
Яны за ўсіх, за ўсіх за нас, і за мяне,
У Вялікую вайну жыццё сваё аддалі.

**Вучань.** Перайшлі вы ў песні і быліны,
У легенды нашае зямлі.
Хтосьці з вас дайшоў да горада Берліна,
Мужныя героі на зямлі Чачэрскай паляглі.

**Разам.** Спіце нашы слаўныя героі!
Мы – нашчадкі – не забудзем вас!

**Вядучы 1.** На Замкавай гары пахаваны 306 воінаў і партызан, якія выканалі свой абавязак перад Радзімай, якой служылі да апошняй кроплі крыві. Побач спачывае прах слаўнай дачкі балгарскага народа, карэспандэнта «Комсомольской правды» Ліліі Карастаянавай. У пачатку лютага 1943 г. падчас бою ў вёсцы Будзішча варожая куля абарвала жыццё палымянай патрыёткі.

**Вядучы 2**. Спіць ў брацкай магіле і юны герой – партызан Грыша Падабедаў. З партызанамі была звязана ўся сям'я Грышы. Начальнікам штаба партызанскага атрада быў яго брат Аляксей.

**Вядучы 3.** Мужна змагаліся нашы землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Радзіма высока ацаніла подзвігі Мікалая Конанавіча Круглікава, Мікалая Сафронавіча Байкова, Ціта Парфёнавіча Новікава, братоў Пятра Ільіча і Аляксандра Ільіча Лізюковых, якія ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Сёння іх няма сярод нас, але іх імёны застануцца ў нашых сэрцах. І кладуцца кветкі да помнікаў і абеліскаў, брацкіх магіл і мемарыяльных дошак.

**Вядучы 1.** Даўно адгрымелі баі Вялікай Айчыннай вайны, нарадзілася некалькі новых пакаленняў, але хацелася б, каб мы ўсе ведалі і цанілі нашу памяць.

**Вядчы 2.** Мова лічбаў сухая, але вы толькі ўявіце… Калі б мы захацелі ушанаваць адной хвілінай маўчання кожнага, хто загінуў у Вялікай Айчыннай вайне, то чалавецтву прыйшлося б анямець на 20 мільёнаў хвілін, амаль на 39 гадоў.

**Вядучы 3.** Таму мы заклікаем вас не толькі помніць і шанаваць нашу гісторыю, але і цаніць, берагчы сённяшні дзень – дзень, які нам пакінулі нашы продкі.

**Чытальнік**

Чачэрскі край – край хлебасольны,
Край гожых хлопцаў і дзяўчат,
Жытнёвы край, дзе так прывольна
Стаяць рады вясковых хат.

Чачэрскі край – край песень звонкіх,
Азёраў чыстых, сініх рэк,
Бяроз бялюткіх, сосен гонкіх.
І шчыры ўсюды чалавек.

Тут шмат садоў і кветак-зорак:
Рамонкаў, сініх васількоў.
Тут наш Чачэрск – славуты горад

Зямлі пад крыламі буслоў.

Чачэрскі край – край працавіты,
У згодзе людзі ўсе жывуць.
Край славай добраю спавіты,
Дзе памяць продкаў берагуць.

Чачэрскі край дае натхненне
Усім жадаючым тварыць,
Мацуе сувязь пакаленняў
І вучыць нас, як трэба жыць.

*Фінальная песня.*